# Дзень добры, навучальны год!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Год выдання XVII-ы

**Беларускі універсітэт**

№ 26 (574)
Аўторак,
1
верасня 1964 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА і ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

Цана 1 кап.

## Поспехаў у вучобе!

Моладзь у нашай краіне акружана вялікай увагай і клопатамі з боку Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада. Штогод адпускаюцца вялікія грашовыя сродкі на падрыхтоўку маладых кадраў спецыялістаў для ўсіх галін народнай гаспадаркі, навукі і культуры.

Колькасць студэнтаў у вышэйшых навучальных установах расце. Павялічваецца і колькасць саміх навучальных устаноў, паляпшаецца іх матэрыяльная база. Толькі за апошнія некалькі гадоў для нашага ўніверсітэта былі пабудаваны галоўны вучэбны корпус (другі па велічыні будынак у Мінску), студэнцкія інтэрнаты па Паркавай вуліцы і па вуліцы Кастрычніцкай, зараз будуецца новы вучэбны корпус, дзе будуць займацца студэнты факультэта радыёфізікі і электронікі.

У гэтым навучальным годзе вучобу ва ўніверсітэце пачнуць 1125 студэнтаў першых курсаў, з іх 250 будуць вучыцца на фізічным факультэце, 225— на матэматычным, 175 — на філалагічным, па 125— на хімічным і біялагічным факультэтах. Вялікая колькасць студэнтаў пачне вучобу на вячэрнім факультэце.

Вельмі цікавыя лічбы, якія характарызуюць сёлетні набор на стацыянарнае навучанне. З 1125 студэнтаў 378 — выхадцы з сем'яў рабочых, 373 — з сем'яў калгаснікаў. Каля 450 студэнтаў маюць двухгадовы стаж работы на прадпрыемствах, установах ці калгасах або дэмабілізаваны з радоў Савецкай Арміі. Прыкладна палавіну студэнтаў складаюць дзяўчаты. Пераважная колькасць студэнтаў — камуністы і камсамольцы.

Перад студэнтамі стаіць галоўная мэта — упартая, сістэматычная, удумлівая вучоба. У іх распараджэнні ўсе ўмовы для таго, каб стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі, каб прынесці максімальную карысць сваёй Радзіме, народу.

З новым навучальным годам, дарагія сябры! Новых вам поспехаў у вучобе, плённай працы, новых удач на шляху да высакароднай мэты!

Да 19-годдзя Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам

## Вечны рэвалюцыйны агонь

80 гадоў В'етнам быў французскай калоніяй. Але в'етнамскі народ, які мае шматгадовыя рэвалюцыйныя традыцыі, ні на імгненне не спыняў барацьбу за свабоду з таго самага дня, калі французскія імперыялісты сілай зброі навязалі сваё панаванне. 19 ліпеня 1945 года пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі Індакітая ўвесь в'етнамскі народ узняўся, як набягаўшая хваля, на ўсеагульнае паўстанне. Амаль не маючы зброі, наш народ захапіў уладу ў свае рукі.

2 верасня 1945 года на гістарычнай плошчы Ба-дзінь прэзідэнт Хо Шы Мін перад усім светам абвясціў аб незалежнасці В'етнама. Была створана Дэмакратычная Рэспубліка В'етнам — краіна народнай дэмакратыі, якая паставіла сваёй мэтай завяршэнне нацыянальна-дэмакратычнай рэвалюцыі і пераход па марксісцка-ленінскім шляху да сацыялістычнай рэвалюцыі. Дзяржаўнага ладу такога тыпу тады яшчэ не ведала ніводная былая каланіяльная ці паўкаланіяльная краіна.

Імперыялісты розных краін прыкладалі і прыкладаюць усе намаганні, каб спыніць в'етнамскі нацыянальны рух. Дзевяцігадовая вайна Супраціўлення закончылася бліскучай перамогай нашага народа. Мы ўпэўнены, што і барацьба народаў Паўднёвага В'етнама супраць амерыканскага імперыялізму таксама будзе пераможнай, бо разам з в'етнамскім народам ідзе поруч у гэтай барацьбе ўсё прагрэсіўнае чалавецтва.

Заўтра 19-я гадавіна ДРВ. Вось ужо ў трэці раз мы, в'етнамскія студэнты, сустракаем сваё светлае свята на савецкай зямлі—у Беларускім універсітэце — разам з савецкімі сябрамі і студэнтамі з некалькіх краін свету. Гэта ўжо шмат гаворыць пра тое, якая ў нас добрая дружба.

Вялікую дапамогу нашай рэвалюцыі аказвае Савецкі Саюз. Нас з вамі, дарагія савецкія сябры, звязваюць непарушныя вузы братняй дружбы і любві. Пачуццё дружбы і ўдзячнасці савецкаму народу — гэта адно самых цудоўных пачуццяў нашага народа.

**НГУЕН КУАНГ МІНЬ,**
**в'етнамскі студэнт 3 курса фізфака.**

**КАЛЕКТЫВУ РЭДАКЦЫІ ШМАТТЫРАЖНАЙ ГАЗЕТЫ**
**БЕЛАРУСКАГА ПОЛІТЭХНІЧНАГА ІНСТЫТУТА**
**«СОВЕТСКИЙ ИНЖЕНЕР»**

ДАРАГІЯ СЯБРЫ!

ГОРАЧА ВІНШУЕМ ВАС З ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕМ З ДНЯ ВЫХАДУ Ў СВЕТ ПЕРШАГА НУМАРУ БАЯВОГА ОРГАНА ПАЛІТЭХНІКАЎ — ГАЗЕТЫ «СОВЕТСКИЙ ИНЖЕНЕР». ШЧЫРА ЖАДАЕМ ВАМ НОВЫХ ТВОРЧЫХ ПОСПЕХАЎ У ВЫСАКАРОДНАЙ ЖУРНАЛІСЦКАЙ ПРАЦЫ, МНОГА РАДАСЦІ І ШЧАСЦЯ Ў АСАБІСТЫМ ЖЫЦЦІ. ЖАДАЕМ ВАМ І НАДАЛЕЙ ВЫСОКА НЕСЦІ ЗВАННЕ САВЕЦКАГА РАБОТНІКА ДРУКУ.

**РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ».**

## *Летнія навіны*

### У гасцях у журналістаў

Загадчык кафедры фізічнай геаграфіі замежных краін нашага ўніверсітэта прафесар Віктар Рыгоравіч Заўрыеў нядаўна вярнуўся з паездкі ў Дэмакратычную Рэспубліку В'етнам, дзе па запрашэнню в'етнамскіх вучоных правёў год. У сярэдзіне жніўня на сустрэчы ў рэдакцыі «Советской Белоруссии» ў яркай, цікавай гутарцы В. Р. Заўрыеў падзяліўся з журналістамі сваімі ўражаннямі аб гэтай дружалюбнай краіне і яе міралюбівым народзе-працаўніку, які будуе сацыялізм.

### Удзельнікі міжрэгіянальнага семінара ў БДУ

У жніўні ў Мінску праходзіў міжрэгіянальны семінар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый «Сацыяльныя аспекты індустрыялізацыі».

18 жніўня, увечары, удзельнікі семінара наведалі наш універсітэт. Тут перад імі выступіў намеснік міністра вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі БССР М. І. Красоўскі. Аб рабоце ўніверсітэта расказаў рэктар, акадэмік АН БССР А. Н. Сеўчанка.

### Вывучэнне ушацкіх азёр

Географы нашага універсітэта пад кіраўніцтвам дацэнта О. Ф. Якушка завяршылі двухгадовую работу па вывучэнню групы ушацкіх азёр.

Вывучалася паходжанне катлавін, глыбіні якіх нярэдка перавышаюць трыццаць метраў. Азёры Крывое, Атолава, Ліпно і некаторыя іншыя ўзніклі ў ледавіковую эпоху. Яны вызначаюцца багаццем фауны. У ліку іншых насельнікаў вод у некаторых з іх можна сустрэць халодналюбівую рэліктавую рыбу сняток. Даследчыкамі складзены карты глыбінь, азёрных грунтоў, графікі тэмператур. Вызначана колькасць кіслароду, кіслотнасці і шчолачнасці вод.

У Мінск дастаўлена шмат узораў азёрных адкладанняў, што дасць магчымасць вызначыць колькасць у іх арганічнага рэчыва.

## ЦАЛІНА. СТУДЭНЦКІ РАБОЧЫ СЕМЕСТР

Яшчэ зімой вырашыў паехаць на цаліннае будаўніцтва. Проста так, з-за цікавасці і, магчыма, з-за жадання ўдыхнуць ветру рамантыкі. Між іншым, «чыстай» рамантыкі я не чакаў: ехалі ж мы на работу ў даўно абжытыя людзьмі мясціны.

Апрача гэтага, суседства нашага саўгаса з раённым цэнтрам Чапаева (станіца Лбішчанская) выклікала ў мяне прафесіянальную цікавасць. Я гатовы быў ехаць на будаўніцтва і дзеля таго, каб адшукаць, убачыць, пахадзіць па дарагіх нам з дзяцінства чапаеўскіх мясцінах.

За два тыдні да адыходу эшалона даведаўся, што я і Іван Харкевіч, мой аднакурснік, павінны выехаць на месца на 7—10 дзён раней, як кватар'еры. Два дні бегалі па магазінах, куплялі ўсё неабходнае, пачынаючы з лыжак і місак...

25 чэрвеня ў 21 гадзіну 30 мінут мы ўсе сабраліся перад вакзалам. Зразумела, урачыстасцей ніякіх не было, нас праводзілі блізкія і сяброўкі.

Прыбылі ва Уральск 28-га на світанні. Непрывычная прамавугольная планіроўка горада. Роўныя і вельмі зялёныя вуліцы. Захавалася многа старажытных каменных будынкаў, якія, напэўна, сустракалі Пушкіна, Талстога, Караленку, Пугачова.

30 чэрвеня прыйшла машына з Чапаева. Наспех паснедалі і ўселіся ў кузаў... Асфальтаванае шасэ, рассунуўшы стэпавыя травы, бяжыць праз раўніну. Рабяты чакалі ўбачыць спаленую сонцам шэрую пыльную прастору, а перад намі— буйная весялосць стэпавых фарбаў. Нават сонца, каб не быць надакучлівым, раз-пораз хавалася за хмары. Але хутка стэп пачаў бляднуць. У запыленым пасёлку спыніліся напіцца. Ідзём шукаць калодзеж. Стэпавая вада непрывычная для нас па смаку, хоць з выгляду зайздросна празрыстая і халодная.

У Чапаеў прыбылі к абеду. У вытворчым упраўленні паабяцалі даставіць нас у бліжэйшую гаспадарку да вечара. А пакуль мы аглядваем усё, што звязана з Чапаевым і яго дывізіяй.

Вечарам стала вядома, што за мной і Ванем з саўгаса прыслалі «Волгу». Рабяты з далёкіх гаспадарак глядзяць на нас з зайздрасцю: ім яшчэ прыйдзецца тут начаваць. А мы праз гадзіну ўжо былі ў кабінеце дырэктара саўгаса імя Куйбышава Валянціна Няфёдавіча Пераажогіна.

7 ліпеня. Разам з дзядзькам Колем, загадчыкам гаспадаркі, наладжваю рукамыйнік. Стараемся ўспомніць, што мы яшчэ не зрабілі. Успомнілі: аказваецца, яшчэ не хапае дзесяткі тры падушак. Знаходзім просты выхад: трэба з'ездзіць у стэп па сена і набіць ім навалачкі. Да чатырох гадзін справіліся з усім. Чакаем. Пяць гадзін, шэсць... Час бы ўжо і быць... Напалілі толькі што складзеную печ, і запрошаная кухарка загрымела ўжо навенькімі каструлямі — трэба ж перакусіць з дарогі. І раптам чую мяккае бурчанне аўтобуса. «Нашы!». Выбягаю насустрач і трапляю ў цеснае акружэнне родных гісторыкаў! Многія пастрыгліся нагала і іх цяжка пазнаць. Камандзір Іван Стадуб па-гаспадарску аглядае памяшканне. Відаць, што ён задаволены і рабяты таксама.

8 ліпеня. Па распарадку ўстаём у сем гадзін. Некаторыя далікатныя натуры скардзяцца на камароў. А іншыя заяўляюць, што спалі вельмі спакойна. Першыя дражняць іх таўстаскурымі. Наш загадчык гаспадаркі Якаў Паўлаў кліча нас да стала. На радасць прыціхлых «кухарак», макароны, якія яны згатавалі, пайшлі... Пасля снедання— арганізацыйны сход. Стадуб гаворыць дзелавіта. Паўлаў выступіў са строгай сухой прамовай, у якой часта паўтараецца «матэрыяльная адказнасць». Нарэшце, мы, «старажылы», выступаем з шэрагам «этнаграфічных заўваг». Вырашана сённяшні дзень прысвяціць добраўпарадкаванню лагера.

Частка рабят узводзіць дапаможныя збудаванні, размячае стэпавы стадыён, астатнія прыбіраюць тэрыторыю, афармляюць лагер. Нампаліт Валерый Протчанка прыбівае ля ўваходу шыльду з назвай лагера: «Космас».

9 ліпеня. Працоўны дзень. На лінейку ўсе выйшлі падцягнутыя, у толькі што атрыманых ад Яшы ваенных гімнасцёрках, штанах і ботах. Мы з Ванем — у групе нарыхтоўкі саману. З дапамогай часова выдзеленага нам інструктара асвойваем «вытворчасць». Як толькі трактар узараў паласу, залілі яе вадой і, падсыпаючы дробную салому, пачалі перамешваць усё гэта з дапамогай тройкі коней. Самым цяжкім у «тэхналагічным працэсе» лічыцца вынманне масы з ямы для напаўнення форм. Маса, змацаваная саломай, вырываецца камякамі. Спіна не вытрымлівае напружання і прыходзіцца браць «на калена». Але самі ўмовы працы падказваюць рацыянальны метад і рэжым. Па-першае, дасталі некалькі форм з доннамі і загружаем іх прама ў яме, беручы саман рукамі. Па-другое, паводле парады суседзяў-цыганоў, заказалі сабе кетмені, якімі зручна і лягчэй выкідваць масу на «бераг»...

З дня ў дзень расце колькасць прадукцыі: 900, 1.200, 1.600, 1.900 цаглін за дзень. Калі нас на самане змяніла 14 ліпеня брыгада Смаляка, мы перадалі ёй набыты вопыт, што і дало ім магчымасць, на нашу думку, дабіцца рэкордных вынікаў.

Уральская вобласць,
студэнцкі будатрад.

**П. САКОВІЧ.**

*Перадрукоўваецца з «Чырвонай змены».*

# КАЛІ ЛАСКА, ПЕРШАКУРСНІКІ, ДА НАС!

Удзельнікі мастацкай самадзейнасці ўніверсітэта доўга будуць памятаць сваю паездку ў сталіцу братняй Украіны. Тым больш, што многія з іх упершыню сустракаліся з кіяўлянамі. Украінскія студэнты — вельмі вялікія знатакі мастацкай самадзейнасці. Таму сустрэча з імі радавала і ў той жа час прымушала хвалявацца.

Аднак хваляванні былі дарэмнымі. Усё атрымалася здарова! Многія нумары выклікаліся на «біс». Апладысменты гледачоў доўга не змаўкалі.

Успамінаецца другая паездка. Севастопаль. Калыска Чарнаморскага флота. Хто не марыць пабываць у гэтым гераічным горадзе?! І вось самадзейныя артысты нашага ўніверсітэта на адным з караблёў Чарнаморскага флота. Зноў апладысменты, выклікі на «біс», зноў поспех.

А колькі такіх радасных сустрэч было! Вільнюс, Львоў і, зразумела, многія гарады і раёны роднай Беларусі. Калгаснікі і рабочыя, воіны Савецкай Арміі і студэнты, дарослыя і дзеці заўсёды з вялікай нецярплівасцю сустракаюць нашых студэнтаў.

А высадка «Вясёлага дэсанту» на цалінных землях далёкага Казахстана! 32 канцэрты далі ў мінулым годзе ўдзельнікі гэтай канцэртнай брыгады на Уральшчыне...

Ва ўніверсітэце працуюць некалькі калектываў мастацкай самадзейнасці: народная харавая капэла (мастацкі кіраўнік — А. І. Білібін), аркестр народных інструментаў (М. А. Лісіцын), танцавальны калектыў (Л. А. Алексютовіч), драматычны калектыў, духавы аркестр (Ф. Бараноўскі), эстрадны аркестр.

Калектывы мастацкай самадзейнасці вну вызначае такая своеасаблівасць: штогод па зразумелых прычынах на 20—25 працэнтаў мяняецца іх склад, бо пяцікурснікі пакідаюць універсітэт, а на іх месца прыходзяць першакурснікі. А гэта вельмі вялікая сіла. Першакурснікі з першых жа дзён навучання становяцца раўнапраўнымі членамі студэнцкага калектыву. І яны маюць поўную магчымасць на справе прымяніць свае здольнасці. Сярод паступіўшых сёлета ёсць шмат танцораў, спевакоў, музык. Нават тыя, хто раней не ўдзельнічаў у мастацкай самадзейнасці, могуць таксама ўліцца ў яе рады, бо пры мастацкіх калектывах ёсць падрыхтоўчыя групы, якімі кіруюць вопытныя спецыялісты.

У сакавіку мастацкай самадзейнасці ўніверсітэта прадстаіць сур'ёзнае выпрабаванне на сталасць: удзел у Трэцяй дэкадзе народнай творчасці Беларускай ССР. Калектывы мастацкай самадзейнасці ўніверсітэта пачнуць падрыхтоўку да яе з першых дзён навучальнага года.

Першакурснік! Цябе чакаюць у калектывах самадзейнасці! Твае задор і выдумка, уменне і настойлівасць будуць садзейнічаць новым поспехам нашай студэнцкай самадзейнасці.

**А. ЗБРЫЦКІ,**
старшыня праўлення клуба БДУ імя У. І. Леніна.





*Калі вы ўважліва слухаеце маскоўскую радыёпраграму «Юнацтва», то, пэўна, чулі перадачы пра Яўгена Казюкіна, аўтара музыкі і тэксту некалькіх студэнцкіх песень. На левым здымку: будучы журналіст Яўген Казюкін (злева), удзельнік універсітэцкага аркестра народных інструментаў.*

*На здымку справа: выконваецца малдаўская сюіта. На сцэне — танцавальны калектыў універсітэта.*

## Запрашаем!

**Рэдакцыя газеты «Беларускі ўніверсітэт» запрашае ўсіх жадаючых прыняць удзел у рабоце газеты. Проза і паэзія, фотаздымкі і малюнкі, аўтарамі якіх вы з'яўляецеся, павінны ўбачыць масавага чытача і гледача.**

**Газета мае наступныя аддзелы, якія працуюць на грамадскіх пачатках: партыйнага жыцця; камсамольскага і прафсаюзнага жыцця; навуковага жыцця; вучэбны; інфармацыі; аглядаў друку; культуры і быту; сатыры і гумару; літаратуры і мастацтва; фізкультуры і спорту; замежны.**

# Знаёмцеся: Анатоль ЯРОХІН, студэнт 1 курса аддзялення журналістыкі

Анатолю Ярохіну — 24 гады. Родам ён з вёскі Казелле, што на Магілёўшчыне. У 1957 годзе скончыў сярэднюю школу. Потым праца, служба ў радах Савецкай Арміі. Пасля дэмабілізацыі Анатоль працаваў у друкарні Краснапольскай раённай газеты. Цяпер, да самага паступлення на аддзяленне журналістыкі нашага ўніверсітэта працаваў інструктарам Краснапольскага сельскага райкома камсамола.

Сёння мы прапануем увазе чытачоў некалькі вершаў, гумарэску Анатоля, а таксама яго невялікі расказ пра родную вёску Казелле. Анатоль быў актыўным карэспандэнтам «Чырвоны сцяг» і армейскай газеты. Спадзяёмся, што яшчэ не раз убачым яго прозвішча на старонках нашай газеты.

## Мае апоры

**Яны раслі пад самыя аблокі.**
**Раслі, заціяўшы цуглі-правады,**
**Цяпер іх хмары абмінаюць бокам,**
**Каб не трапаць аб скобы барады.**
**Цяпер іх не скарыць вятрам няўмольным,**
**І бурам не сагнуць і не зламаць.**
**І хоць раслі яны павольна,**
**Затое ім упэўнена стаяць.**
**Ад іх і у мяне характар строгі,**
**Яны — метал, я — чалавек.**
**Калі я цвёрда стаў на ногі,**
**То гэта значыць — стаў навек!**

## Родная вёска Казелле

У баку ад вялікіх дарог раскінулася вёска Казелле. З трох бакоў яе акружае лес, а наўсцяж цягнуцца лугі і палі.

Некалі гэтыя палі і лугі пану належалі, а сялянскія надзелы гаротна цясніліся на балотных купінах ды па лазняку. Але прыйшоў Кастрычнік, і назаўжды змянілася аблічча вёскі. Былое панскае поле пачало называцца «чырвоным», бо на ім заклалі вясковыя беднякі першую грамадскую гаспадарку і далі ёй назву «Усходняя зорка».

Ішлі гады. Заможна жылі сяляне, весела гучалі дзявочыя песні ў лузе. Ды надышла чорная гадзіна. Каваныя боты гітлераўскіх катаў пачалі таптаць калгасныя палі і сенажаці. Але доўга гаспадарыць чужынцам на нашай зямлі не давялося.

Непазнавальна змянілася вёска за дваццаць гадоў пасляваеннага жыцця. Раней у Казеллі быў калгас «Шлях сацыялізма», а цяпер тут аддзяленне саўгаса «Дружба».

У вёсцы пабудавана школа-васьмігодка, а ля яе вырас новы жылы пасёлак, які мае аднавясковцы Касмічным завуць. У кожным доме — радыё або прыёмнік. У вёсцы ёсць клуб, у клубе — бібліятэка. Двойчы ў тыдзень у клубе дэманструюцца кінафільмы. Працуе гурток мастацкай самадзейнасці, які часта выступае перад рабочымі саўгаса з канцэртамі.

У вёсцы паявілася новая прафесія рабочых—механізатар. З кожным годам гэтая дружная сям'я папаўняецца. Толькі ў бягучым годзе па накіраваннях саўгаса вучацца ў вучылішчах механізацыі пяць чалавек.

Мая вёска дала Радзіме многа ўрачоў, настаўнікаў, камандзіраў і палітработнікаў Савецкай Арміі, спецыялістаў сельскай гаспадаркі, інжынераў, шахцёраў. І хоць не ўсе яны працуюць у роднай вёсцы, але разбег для жыццёвага палёту яны рабілі тут, у Казеллі.

У Казеллі нарадзіўся і вырас вялікі рускі доменшчык і рэвалюцыянер Расіі Міхаіл Канстанцінавіч Курака. Ёсць у вёсцы свае заслужаныя людзі, ардэнаносцы, ветэраны калгаснага руху і сацыялістычнага будаўніцтва.

Працай сваёй слаўны чалавек. Не дзіва, што на раённай Дошцы пашаны сярод перадавікоў калгаснай і саўгаснай вытворчасці ёсць і імёны казельскіх жывёлаводаў.

Некалі вялікі рускі паэт Некрасаў пісаў: «Меж высоких хлебов затерялося небогатое наше село...» Паэт пісаў пра горкае жыццё народа. Пра наша ж сучаснае жыццё складаюцца ўзнёслыя вершы, спяваюцца вясёлыя песні.

І хоць далёка ад вялікіх дарог ляжыць Казелле, але яно жыве вялікімі зменамі, вялікімі падзеямі, прыгожым і зайздросным жыццём.

* * *

Для мяне перад сном
Дзве бярозы-задзіры
Кожны раз перад сном
Хараводы вадзілі.
Вешаў бусы ім вечар,
Росы з луга сабраўшы.
Мне шаптала іх вецце
Аб каханні гарачым.

* * *

Выйдзі вулкаю гамонкай
Адвячоркам ціхім,
Калі зоры, як рамонкі,
У здзіўленні сціхнуць,
Калі месяц з-за бяроз
Выгляне ў далечы.
Выйдзі з-за крынічных лоз,
Выйдзі на сустрэчу.

ГУМАРЭСКА

## ПРАСВЯТЛЕННЕ

*Дзед Свірыд — чалавек ціхі. Іншы раз з яго, як кажуць, слова не выціснеш. А ў той вечар старога нібы падмянілі: грыміць на сваю бабку Матрону так, што ў канцы вуліцы чуваць. І ўсё з адной і той жа прычыны: святкаваць каляды ці не. Наконт гэтага ў іх спрэчка ідзе не першы год.*

*Раней стары ішоў на хітрыкі, маўляў, каляды для мяне нішто, але ж чаму не выпіць, калі Матрона прапаноўвае. А цяпер дзед Свірыд вырашыў адзначаць толькі тыя святы, якія святкуюць усе людзі. Так і сказаў сваёй Матроне.*

*— Што ты прэш, стары дурань?— ускіпела бабка.—Пабойся бога, антыхрыст.*

*— А ты не антыхрыст?—рассмяяўся дзед. — Сама ж усё жыццё левай рукой хрысцішся.*

*— Я хоць левай, а ты ж —ні левай, ні правай, каб табе яны... Ой, горачка ты маё. Вось гэтак і мучаюся ўсё жыццё з табой, антыхрыст, п'яніца, — загаласіла бабка.*

*— Гэта я антыхрыст, п'яніца?— узлаваўся дзед Свірыд. — І ўсё праз гэтую мазню, — паказаў ён на кут, дзе вісела ікона, пакрытая закапцелым ручніком.*

*— Госпадзі, міласэрдны,— перахрысцілася бабка левай рукой,— ты чуеш, што гэты стары пляце? Даруй яму, дурню гэтаму.*

*Дзед Свірыд кіпеў, бы той самавар. Цярпенню яго прыйшоў канец. Стары скочыў на лаўку, рвануў ікону і шпульнуў да печы так, што ікона развалілася на часткі. А сам апрануў выхадное паліто, выйшаў на двор і па заснежанай вуліцы накіраваўся ў бок клуба, адкуль даносіліся вясёлыя песні моладзі.*

## Са студэнцкага гумару

* * *

— Вы ўсе лекцыі спіце за сталом, — абураецца дэкан. — Зайдзіце да мяне ў кабінет!

— Выбачайце, — адказаў студэнт, — але за Вашым сталом я спаць не магу.

* * *

— Як толькі цябе ўбачу, мне адразу ўспамінаецца Пятрэнка з трэцяга курса.

— Але ж я на яго зусім не падобны.

— Гэта правільна. Толькі ён мне таксама павінен пяць рублёў.

* * *

— Студэнт Іваноў, скажыце, калі ласка, хто ў вашай групе лепш за ўсіх ведае мову.

— У маёй групе — я. Нядаўна мы пісалі дыктант. Я атрымаў «здавальняюча», а ўсе астатнія— «двойкі».

* * *

— Што такое сесія? — пытаецца абітурыент у выпускніка.

— КВЗ, мой сябар!

* * *

— Пытанне абдумалі?

— Так.

— Тады адказвайце.

— Але я яшчэ не абдумаў адказ.

## Цікава ведаць!

Гіганцкая яблыня расце ў адкрытым полі каля эксперыментальнай базы «Полі» — цэнтра навуковага садаводства Эстоніі. Вышыня яе 18 метраў, абхват — 4,2 метра, акружнасць кроны каля 50 метраў. Дрэву больш за 200 гадоў. Яно штогод прыносіць плады.

З насення гэтай яблыні на базе вырошчваюць прышчэпы, якія вытрымліваюць больш 40° марозу.


**За рэдактара Я. ЛЯХАЎ.**

**Адрас рэдакцыі:**
г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 10916. Зак. 3114. Тыр. 2000.